# Змест

Таямніца Густога лесу, або з чаго ўсё пачалося . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Пунсовая Ружа і сад вядзьмаркі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Жоўтая Ружа і лясная чарадзейка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Белая Ружа і чорны рыцар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Кармінавая Ружа і кароль эльфаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Блакітная Ружа і скарб волаткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Залатая Ружа і чароўны калодзеж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Чорная Ружа і вандроўны музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90



# Таямніца Густога лесу, або З чаго ўсё пачалося

Даўным-даўно, стагоддзі таму, было на зямлі адно запаветнае месца — Густы лес. Такі вялізны, што ахопліваў межы сямі краін. Лес гэты насялялі чароўныя істоты, якія рэдка трапляліся на вочы чалавеку: чарадзеі, эльфы, тролі, лясныя феі, грыбныя гномы, лесавікі… Часам яны жылі мірна, часам сварыліся. А раз на сто гадоў жыхары Густога лесу збіраліся на таямнічае свята і рабілі падарункі не адно аднаму… а людзям. Менавіта людзям, бо ў іх жыцці так мала чараўніцтва. Праўда, людзі часцей за ўсё не ведалі пра тыя падарункі. Яны думалі, што ім проста пашанцавала.

І вось у адно такое свята насельнікі Густога лесу распалілі вогнішча да неба, селі вакол яго і спыталі старую, як сам лес, чарадзейку:

— Што мы падорым людзям на гэты раз?

Старая чарадзейка задуменна паглядзела на агонь. Толькі яна магла распазнаць там схаваныя знакі.

— Я бачу ружу, — нарэшце сказала яна. — І не адну, а сем. Сем цудоўных ружаў! Мы падорым іх маленькім дзяўчаткам. Хтосьці атрымае кветку з нараджэння, хтосьці — толькі з часам. І жыццё кожнай дзяўчынкі ад гэтага зменіцца.

Пунсовую ружу знойдзе самая цікаўная. Праз тую цікаўнасць ёй давядзецца шмат чаго вытрываць, але шчасце не абміне яе.

Жоўтую ружу знойдзе самая кемлівая. Нават там, дзе ніколі не свеціць сонца, яна здолее адшукаць і выратаваць дарагога чалавека.

Белую ружу знойдзе самая адданая. Дзеля сваёй сям'і яна выправіцца ў небяспечнае падарожжа. Але злыя чары адступяць перад ёю.

Кармінавую ружу знойдзе самая добрая. І дабрыня вернецца ёй стакроць. Яна займее сяброў і дом там, дзе менш за ўсё будзе гэтага чакаць.

Блакітную ружу знойдзе самая сціплая. За ціхі нораў яна атрымае скарбы, пра якія магла толькі марыць.

Залатую ружу знойдзе самая моцная духам. Яна захоча вызваліць аднаго чалавека, а ўратуе цэлае каралеўства.

Чорную ружу знойдзе самая адважная. Яна не спалохаецца ні ворага, ні нават смерці.

Жыхары Густога лесу схілілі галовы перад старой мудрай чарадзейкай. І той жа ноччу цудоўныя кветкі пусцілі карані ў кожнай з сямі краін, што межавалі з Густым лесам. Ружы чакалі сустрэчы з тымі, для каго былі прызначаныя.

Але пра лясное свята і пра тое, адкуль узяліся сем чароўных ружаў, ведаем толькі мы з вамі. Астатнія чулі адно старыя казкі пра прыгоды дзяўчат з кветкавымі імёнамі. І калі вы яшчэ не чыталі гэтыя казкі, самы час пачаць.




Кармінавая
Ружа
і Кароль
Эльфаў

У адным маленькім каралеўстве жыў-быў кароль, які любіў рэдкасці і дзівосы. Як бачыў нешта незвычайнае — адразу прасіў, калі не аддавалі — купляў, а калі не прадавалі — адбіраў сілай. У ягоным палацы былі самыя прыгожыя карціны і статуі, у садзе раслі цудоўныя кветкі, а ў звярынцы жылі звяры і птушкі з далёкіх краін. Кароль часта запрашаў да сябе знатных гасцей і важных навукоўцаў. Госці захапляліся ягонай калекцыяй, навукоўцы пісалі пра яе тоўстыя кнігі. І ўладару больш нічога не трэба было для шчасця.

Аднойчы кароль паказваў свой сад заморскаму знаўцу кветак. Той ахаў і вохкаў, разглядаючы пялёсткі і бутоны, а потым і зусім закрычаў ад захаплення:

— Што за ружа! Што за колер! Ніколі гэткага хараства не сустракаў! — і паказаў пальцам у самы канец саду.

Кароль паглядзеў туды і ўбачыў маленькую дзяўчынку, якая гуляла за агароджай. У ейных валасах была ружа, ці то чырвоная, ці то ружовая, ці то ліловая.

— Клянуся сваім залатым зубам, такі колер называецца кармін! — працягваў захапляцца знаўца. — Кажуць, гэта колер лясных эльфаў!

Уладар адамкнуў брамку і паклікаў дзяўчынку:

— Гэй, Кармінавая Ружа, хадзі-тка сюды!

Тая, пачырванеўшы, зайшла ў сад.

— Дзе ты ўзяла кветку, што ў тваіх валасах? — спытаў кароль.

— Нехта кінуў яе мне ў рукі, калі я ішла па ўскрайку Густога лесу. Я не бачыла, хто гэта быў.



Кароль задумаўся, як завалодаць ружай. Адымаць яе ў дзіцяці пры замежным госцю неяк няёмка. Можа, прапанаваць дзяўчынцы наўзамен цацкі альбо цукеркі? А знаўца кветак тым часам спытаў:

— Гэтае чароўнае дзіця жыве пры палацы?

— Так, вядома! — схлусіў кароль і ўзрадаваўся, што праблема так лёгка вырашылася. Калі ружа сарваная, дык няхай дзяўчынка пабудзе замест вазы. Ён перадаў знайду фрэйлінам, якія яе вымылі, прычасалі ды адзелі ў прыгожую сукенку. І ўжо ўвечары ўладар паказаў малую, якую сталі зваць Кармінавай Ружай, усім сваім гасцям.

А потым высветлілася дзіўная рэч. Лясная ружа кармінавага колеру была свежай і прыгожай толькі ў валасах дзяўчынкі. Калі яе вымалі і ставілі ў вазу, яна чэзла і апускала галоўку. А вярталі малой — зноў ажывала. І таму кароль вырашыў пакінуць Кармінавую Ружу пры сваім двары назаўсёды, а не толькі на час балю. Дзяўчынка аказалася сіратой, і далёкай радні не было да яе справы. А каралеўскай дачцэ, ейнай аднагодцы, не зашкодзіла б яшчэ адна служанка альбо жывая цацка.

Бедная сіротка нават і не марыла пра такое шчасце: жыць у палацы! Ды яшчэ паўнюткім усялякіх небывалых рэчаў. Кожны дзень, калі маленькай каралеўне надакучвала з ёю гуляць, Кармінавая Ружа магла ісці альбо ў сад, альбо ў звярынец, альбо ў карцінныя залы. І вось аднойчы, блукаючы сярод кветак, дзяўчынка пачула працяглыя гукі рога. Гэта каралеўскія паляўнічыя вярталіся з Густога лесу. Яны цягнулі за сабой клетку, у якой хтосьці сядзеў. Кармінавая Ружа пабегла за імі ды ўбачыла, што ў клетцы зусім



не звер, а дзіўны лясны чалавек з перапэцканай скурай, срэбрана-белымі валасамі і ў вопратцы з лісця.

На гукі выбег сам кароль. Паляўнічыя пакланіліся яму і паведамілі:

— Мы злавілі гэтую істоту ў лесе, Ваша Вялікасць. Яна не чапала нас, але мы звязалі яе і кінулі ў клетку.

— Цудоўна! — задаволена ўсклікнуў кароль. — Змясціце чалавеказвера побач з мядзведзем і шакалам.

Кармінавай Ружы стала шкада ляснога жыхара. Акрамя таго, ёй вельмі захацелася разгледзець яго бліжэй. Увечары, калі ўсе цікаўныя госці сышлі, яна прыйшла ў звярынец і з асцярогай наблізілася да клеткі. Чалавек унутры не падаўся дзяўчынцы страшным, наадварот, рысы ягонага твару былі нават прыгожыя.


Залатая Ружа
і Чароўны
Калодзеж

Ля самага краю Густога лесу жыў дрывасек. Была ў яго дачка-прыгажуня з валасамі колеру чыстага золата. У дзяцінстве ейныя валасы-завітушкі нагадвалі маленькія ружачкі на кусце. Таму бацька і стаў называць яе Залатая Ружа.

Іхняя хатка была такой маленькай, што ў ёй маглі змясціцца толькі сам дрывасек, дачушка, печка ды сякера. А ля ганка стаяў стары замшэлы калодзеж без вады. «Якая ад яго карысць!» — думаў бядняк і неяк хацеў закідаць калодзеж камянямі ды зраўняць з зямлёй. Толькі Залатая Ружа не дала яму гэтага зрабіць. Яна мела сваю таямніцу: варта было нахіліцца да калодзежа і задаць пытанне, як нечы прыглушаны голас ёй адтуль адказваў. І заўсёды гаварыў праўду альбо даваў слушныя парады.

Жылі яны жылі ў сваёй хатцы, і аднойчы дрывасек сказаў дачцэ:

— Няблага было б папрасіць у каралевы кавалачак зямлі. Я пасеяў бы там пшаніцу ці, мо, яблыневы сад бы разбіў. Цябе замуж пара выдаваць, а пасаг — толькі гэты стары калодзеж!

Але зямля ў той час каштавала дорага, а старая каралева-скнара запатрабавала і таго болей. Дрывасек прыйшоў дадому пануры, і Залатая Ружа, убачыўшы гэта, пабегла да свайго калодзежа.

— Няхай твой бацька просіць кавалак зямлі ля Густога лесу, — параіў ёй глухі голас, — там, дзе дубовы гай. А грошы аддасць пазней.

— Адкуль ён іх возьме? — здзівілася дзяўчына. — Калі запазычыцца каралеве, можна і без галавы застацца!

— Вер мне, — ціха адказаў калодзеж.

